ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ



№ 7 (1040) | ЧАЦВЕР, 10 красавіка 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

З міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі

## СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ – БАКАЛАЎРЫ І МАГІСТРЫ

**Вышэйшая адукацыя ў нашай краіне набыла па-сапраўднаму масавы характар. Так, толькі ў ВНУ Гомельшчыны на сённяшні дзень вучацца звыш 40 тыс. студэнтаў, што ў 7 разоў перавышае паказчык 1960 г. і амаль ўдвая – 1990 г.**

**Сённяшнія рэаліі часу патрабуюць разам з тым павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, змен у той класічнай схеме вышэйшай адукацыі, якая на працягу доўгіх гадоў дзейнічала ў краінах СНД. Узровень кампетэнтнасці дыпламаваных спецыялістаў павінен адпавядаць новым патрабаванням, бо зараз адбываюцца істотныя змены на сучасным рынку працы. Каб Беларусі не апынуцца па-за межамі сусветнай адукацыйнай прасторы, стаіць задача мадэрнізацыі існуючай сістэмы вышэйшай адукацыі ў рамках міжнародных дакументаў (Балонскай дэкларацыі і Лісабонскай канвенцыі), якія ў асноўным вызначаюць стратэгію вышэйшай адукацыі ў свеце.**



Адным з асноўных шляхоў вырашэння праблемы суадносін масавасці і якасці адукацыі з'яўляецца яе пераход на дзвюхступеньчатую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў, пры якой на 1-й з іх рыхтуецца масавы спецыяліст, г.зн. канкрэтны выканаўца (бакалаўр), а на 2-й – элітны спецыяліст, які зможа працаваць у сферы навукі, вышэйшай школы, органах дзяржаўнага кіравання, на кіруючых пасадах ва ўсіх галінах эканомікі (магістр).

Актуальным пытанням навукова-метадычнай работы: шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў і прысвячалася міжвузаўская навукова-метадычная канферэнцыя, якая праходзіла на працягу двух дзён на базе нашага ўніверсітэта. Яе арганізатарамі з'яўляліся Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі аблвыканкам, Савет рэктараў ВНУ Гомельшчыны, вучэбна-адукацыйная ўстанова БДУ "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", наш універсітэт.

Аб важнасці і маштабнасці канферэнцыі сведчыць вялікая колькасць яе дэлегатаў – прадстаўнікоў практычна ўсіх ВНУ рэспублікі, у тым ліку г. Гомеля, і навукоўцаў з далёкага і блізкага замежжа – Італіі і Літвы.

Пленарнае пасяджэнне канфэрэнцыі адкрыў рэктар ГДУ д.ф-м.н., прафесар М.В. Селькін. Ён адзначыў, што рэфарміраванне вышэйшай школы, пераход на дзвюхступеньчатую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў не зводзіцца да простых арганізацыйных, структурных пераўтварэнняў па пераходу на 4-5-6-гадовыя тэрміны навучання. У большай ступені размова ідзе аб пераглядзе зместу вучэбных планаў і праграм, карэнным паляпшэнні вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу, змене структуры аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў, а таксама пашырэнні актыўных форм і метадаў арганізацыі навучання. У сувязі з гэтым, – падкрэсліў Міхаіл Васільевіч, – важна вызначыць месца і ролю рэгіянальных ВНУ ў рэфарміраванні вышэйшай школы, а таксама дапамагчы выкладчыку разабрацца ў сэнсе новаўвядзенняў у змесце адукацыі.

Адзначалася, што ў ГДУ ўжо ёсць пэўныя напрацоўкі па пераходу да шматузроўневага навучання: сумесна з РІВШ праведзены вучэбныя курсы для кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, выкладчыкаў, актыўна ўкараняюцца ў практыку новыя адукацыйныя тэхналогіі, сістэмы кантролю ведаў і г.д. У той жа час нам яшчэ многае трэба спасцігаць у пераходзе на новую сістэму. Канферэнцыя і ставіла сваёй мэтай абмен вопытам паміж ВНУ ў гэтай справе. А ён ужо даволі значны, у прыватнасці, у БДУ, Полацкім дзяржуніверсітэце, адкуль прыехала вялікая група выкладчыкаў.

На канферэнцыі выступіў начальнік Галоўнага ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі рэспублікі В.Л. Цыбоўскі. Ён падкрэсліў, што для Беларусі пераход на новую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў адыграе станоўчую ролю, таму што гэтая сістэма адлюстроўвае сусветны вопыт, захоўвае традыцыі айчыннай вышэйшай школы, будзе ўлічваць рэформу сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і многія эканамічныя фактары. Пераход да яе будзе паэтапным, і гэта патрабуе выпрацоўкі навуковых і метадычных распрацовак.

На канферэнцыі праходзіў абмен вопытам распрацоўкі і ўкаранення адукацыйных праграм шматступеньчатай вышэйшай адукацыі ў БДУ, падрыхтоўкі магістраў у Полацкім дзяржуніверсітэце, правядзення эксперыменту па ўкараненню 10-бальнай сістэмы ацэнкі ведаў студэнтаў, самакантролю якасці адукацыі.

Каля 100 дакладаў было абмеркавана ў час работы 3-х секцый канферэнцыі – "Сутнасць, змест і перспектывы развіцця шматузроўневай вышэйшай адукацыі", "Распрацоўка і ўкараненне новых адукацыйных тэхналогій", "Сістэма кантролю ведаў і самастойная работа студэнтаў". Вельмі цікавымі былі выступленні прафесара Шауляйскага ўніверсітэта В. Ламанаускаса і прафесара факультэта псіхалогіі Фларэнційскага ўніверсітэта Стэфана Тадэя, якія дзяліліся вопытам сваіх краін па развіццю дзвюхступеньчатай сістэмы адукацыі.

На заключным пасяджэнні, якое вёў старшыня аргкамітэта канферэнцыі, прарэктар па вучэбнай рабоце ГДУ д.ф-м.н., прафесар С.Ф. Каморнікаў, прагучала галоўная думка – пераход на шматузроўневую сістэму падрыхтоўкі



спецыялістаў неабходны і непазбежны. Удзельнікамі канферэнцыі распрацаваны рэкамендацыі па абмеркаваных пытаннях, якія будуць прадстаўлены ў Міністэрства адукацыі рэспублікі і РІВШ для іх уліку пры распарацоўцы нарматыўнай базы рэформы вышэйшай адукацыі.

Для ўдзельнікаў канферэнцыі ў фае актавай залы была наладжана выстаўка навуковых работ выкладчыкаў універсітэта, якую падрыхтавалі работнікі бібліятэкі ГДУ.

Т.НІКАЛАЕВА.

**НА ЗДЫМКАХ: абмен думкамі: рэктар ГДУ д.ф-м.н., прафесар М.В. Селькін і начальнік Галоўнага ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі В.Л. Цыбоўскі; у час работы секцыі канферэнцыі. На пярэднім плане – прафесар В. Ламанаускас (Літва).**

Фота У. ЧЫСЦІКА.

## ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНЦКАГА ФОНДУ

Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб зацвярджэнні рашэння Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў" грашовымі прэміямі ўзнагароджаны пераможцы рэспубліканскіх прадметных алімпіяд і конкурсаў прафесійнага майстэрства, праведзеных у 2001-2002 навучальным годзе, а таксама выкладчыкі, вучоныя і іншыя асобы, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі. Сярод узнагароджаных – дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.С. Новак і загадчык кафедры, доктар філалагічных навук, прафесар І.Ф. Штэйнер.

Нагадаем: студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя "Вандроўнік", створаная пры кафедры і кіраўніцтва якой імі ажыццяўляецца, атрымала грант Савета спецыяльнага фонду за вялікую работу па прапагандзе, адраджэнню і захаванню фальклорнай спадчыны Гомельшчыны.

**Камітэт эканомікі Гомельскага аблвыканкама выказвае падзяку рэктарату Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны і асабіста рэктару прафесару М.В. Селькіну за аказанае садзейнічанне ў правядзенні рэспубліканскай нарады па пытаннях удасканалення рэгіянальнай навукова-тэхнічнай палітыкі, якая адбылася 14 сакавіка 2003 года, а таксама за высокі ўзровень арганізацыі выставы навукова-тэхнічных распрацовак, выкананых вучонымі ўніверсітэта.**

**Э.Л. КАРНІЦКАЯ,**
**старшыня камітэта.**

Аб размеркаванні маладых спецыялістаў

## ПЕРШЫ ВЫПУСК ЭКОЛАГАЎ

**Пачатак красавіка штогадова прыносіць пяцікурснікам універсітэта нямала хваляванняў і турбот. Пад іх студэнцкім жыццём падводзіцца своеасаблівая рыса – яго ўмоўна можна лічыць завершаным, хаця да атрымання дыплома застаецца яшчэ крышачку часу. Пастаўлены пры размеркаванні студэнтам подпіс насупраць назвы месца будучай працы надае яму ўжо новы статус, згодна якога можна лічыць сябе гатовым да самастойнай працоўнай дзейнасці.**

Размеркавальная "эпапея" у ГДУ толькі што скончылася і можна падвесці яе галоўныя вынікі. Канешне, задаволіць па максімуму патрэбы ўсіх без пяці мінут маладых спецыялістаў у тых добрых месцах працы, аб якіх ім марылася, не ўяўляецца магчымым, хіба што толькі акрамя выдатнікаў вучобы, якія мелі права лепшага выбару (на жаль, не на ўсіх спецыяльнасцях), ды кантрактнікаў. Тых, хто вучыўся на дзяржаўныя, бюджэтныя сродкі, членам размеркавальнай камісіі неабходна накіроўваць туды, дзе ёсць патрэба ў кадрах, асабліва педагагічных. Побыт на іх пакуль ёсць, хаця ў не такой ужо аддаленай будучыні, па прагнозах спецыялістаў, ён будзе скарачацца. Аб гэтым нагадвае дэмаграфічная сітуацыя ў краіне.

А сёлета для школ нашай вобласці спатрэбілася настаўнікаў фізкультуры – 63, біялогіі – 62, матэматыкі – 51, англійскай мовы – 45, гісторыі – 43… Гэтыя і іншыя лічбы былі даведзены ў план персанальнага размеркавання выпускнікоў педспецыяльнасцей ГДУ. Згодна яго і працавала камісія.

Што ж датычыць пяцікурснікаў вытворчых спецыяльнасцей, тут сітуацыя зусім адваротная: шукаць работу многім студэнтам даводзіцца самім, бо прапанаваць ім нешта з-за складанай эканамічнай сітуацыі ў краіне не ўяўляецца магчымым. (Дарэчы, гэта паўтараецца ўжо не першы год). Вось і папаўняюць яны, у асноўным, розныя камерцыйныя,



прыватныя прадпрыемствы і фірмы.

Сёлета ўпершыню наш універсітэт ажыццявіў выпуск 43-х студэнтаў па спецыяльнасці "Экалогія". Але, на вялікі жаль, толькі некаторыя з іх аказаліся запатрабаванымі для выкладчыцкай працы сярэднімі адукацыйнымі школамі горада і вобласці, астатнія самастойна шукалі месцы прымянення сваім ведам у арганізацыях, на прадпрыемствах адпаведнага профілю, куды і атрымалі накіраванні. У ГДУ, на кафедры экалогіі, будзе працаваць выдатніца вучобы **Наталля Карліонава (на здымку).**

Усяго сёлета ГДУ даў пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё 994 юнакам і дзяўчатам, каля 30 з якіх застаюцца на кафедрах універсітэта.

**(Наш кар.)**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

Абмеркавана на Савеце ўніверсітэта

## БІЁЛАГІ – У ЛІДЭРАХ, ЮРЫСТЫ – У АДСТАЮЧЫХ

**На чарговым пасяджэнні Савета ўніверсітэта, якое адбылося ў канцы сакавіка, прааналізаваны вынікі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. З інфармацыяй па гэтаму пытанню выступіла начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова.**

**Агульная паспяховасць склала па ўніверсітэту 85%, што на 4,2% вышэй, чым у зімовую сесію мінулага навучальнага года. Самыя лепшыя паказчыкі па ведах у будучых біёлагаў – 93, 4%. А вось студэнты юрыдычнага факультэта, на жаль, апынуліся па ўзроўню паспяховасці на апошнім месцы ва ўніверсітэце – 77,8 %.**

На "выдатна" вытрымалі выпрабаванне на веды 20,9 % студэнтаў, толькі на "здавальняюча" 5,2 %, двойкі атрымалі 12,1 %. Не з'явіліся на залікі і экзамены па няўважлівых прычынах 87 чалавек. Адлічаны з універсітэта за непаспяховасць: у лютым – 2 студэнты, у сакавіку – 12.

### З ЎЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую добрасумленную працоўную дзейнасць, высокі прафесіяналізм начальнік планава-фінансавага аддзела* ***ПАШУК Святлана Яўгенаўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

•••

*За шматгадовую плённую працу, творчыя і добрасумленныя адносіны да выканання сваіх службовых абавязкаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта начальнік планава-фінансавага аддзела* ***ПАШУК Святлана Яўгенаўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

(ОКОНЧАНИЕ. НАЧАЛО на 3-й стр.)

**И.И.** Паскевич в целом строго придерживалась текста романа, однако в последних частях эпопеи, главным образом, в тех местах, где имеются исторические и философские размышления автора, содержащие критику официальной исторической науки и характеристику Наполеона как агрессора, были допущены ряд изменений текста. Поступая таким образом, княгиня-переводчица, как можно полагать, исходила из личных идейных убеждений. При внесении иных незначительных изменений в текст романа переводчица, по всей видимости, руководствовалась собственным литературным вкусом.

Переводчик всегда в известном смысле – соперник автора, и в этом плане И.И. Паскевич проявила искреннюю скромность, указав на французском переводе романа Льва Толстого не свое истинное имя, а псевдоним. Занимаясь переводом, княгиня не думала о славе переводчика, а просто реализовывала свое художественное дарование и стремилась донести до зарубежного читателя взволновавшее и восхитившее ее произведение талантливого писателя. Мы не преувеличим, если скажем, что отличительной чертой характера Ирины Ивановны Паскевич было стремление делать добрые дела. Во всей наглядности это проявилось в ее благотворительной деятельности.

**Н**ачало благотворительной деятельности княгини Ирины в Гомеле относится к 1857 году. Она обязалась жертвовать ежемесячно по 10 рублей серебром для бесплатного женского училища в предместье города. В дальнейшем на частные средства Паскевичей по инициативе Ирины Ивановны содержались приют для девочек-сирот, детский приют городского попечительства о бедных и богадельня для пожилых женщин. В детских приютах Ирина Паскевич лично отбирала наиболее способных детей и обеспечивала им образование, готовила специалистов. На деньги Паскевичей в 1898 году была построена гомельская мужская классическая гимназия (ныне – один из корпусов Белорусского государственного университета транспорта).

Во второй половине XIX века

## «UNE RUSSE» («ОДНА РУССКАЯ»)

### *Кто она, первый переводчик романа Л.Н. Толстого «Война и мир" на французский язык?*

княгиня Ирина посылает своего воспитанника А. Брука в Швейцарию учиться на глазного врача и строит в Гомеле глазную лечебницу, функционировавшую до 1941 года. А. Брук, подобранный княгиней прямо на улице, где он торговал «маковниками» – булочками с маком, стал знаменитым врачом по глазным болезням. В Гомель на прием к Бруку приезжали из самых разных городов страны. Благотворительная деятельность Ирины Ивановны Паскевич приобрела особый размах после смерти мужа (Федор Иванович Паскевич умер в возрасте 80 лет), с которым она прожила вместе полвека.

В 1903 году, после смерти князя Федора Паскевича, Ирине Ивановне Паскевич было 68 лет, и она очень остро переживала свое одиночество. Детей у княгини не было, кроме того, жизнь ее осложнялась тем, что она очень рано стала терять зрение, из-за чего пришлось прекратить и занятия литературными переводами. Выезды в столицы также давно прекратились, и лишь в летнюю пору княгиня с мужем (когда он был еще жив) ненадолго покидала Гомель и жила в какой-нибудь из своих загородных усадеб.

Старость княгини была обставлена очень скромно. Старожилы, видевшие ее, рассказывали, что эту небольшого роста, худенькую женщину, одетую обыкновенно во все черное или коричневое с белыми кружевами на рукавах платья и на воротнике и в мелкой шапочке на голове, можно было скорее принять за горничную, служанку, чем за княгиню. Все свое существование Ирина Ивановна подчинила служению Гомелю, ставшему для нее родным, и отечеству.

В 1907 году она выделила деньги на строительство в городе водопровода, подарила гомельскому мужскому приходскому училищу каменное здание стоимостью 8 тысяч рублей для размещения ремесленных классов. В пригородных деревнях на деньги княгини содержались народные училища. В Гомеле для детей был организован музыкальный салон. Сама княгиня очень увлекалась хоровым пением и принимала деятельное участие во всех главных праздниках года. На святки каждый ребенок Гомеля получал от княгини Ирины подарок. На писчебумажной фабрике Паскевичей, размещавшейся в окрестностях Гомеля, в местечке Добруш, впервые в России был введен восьмичасовой рабочий день. В 1912 году на средства Ирины Ивановны развернулось строительство гинекологической больницы и родильного дома в Гомеле. Более 250 тысяч рублей княгиня пожертвовала на строительство нейрохирургической клиники Пирогова в Петербурге.

После начала Первой мировой войны на базе лечебных заведений Гомеля и окрестностей княгиня организует лазареты для лечения раненых, а в конце 1914 года начинает строительство военного госпиталя на 100 кроватей. В 1915 году гомельский дворец, госпиталь и лазареты посетил император Николай Второй, лично выразивший княгине Паскевич благодарность за заботу о больных и раненых русских воинах.

***

**12** ноября 1917 года власть в Гомеле перешла к местному Совету рабочих и солдатских депутатов. Еще через три дня престарелая княгиня Паскевич, собрав списки всего движимого и недвижимого имущества, отправила дарственную новым властям. После этого она ушла из своего дворца навсегда. Ей дали комнату в одном из домов города, где княгиня и жила до самой смерти, имея лишь «няню» – служанку, приносившую продукты и ухаживавшую за старухой. По некоторым сведениям, какое-то время княгиню содержал ее воспитанник, глазной врач Брук, и она жила в глазной лечебнице.

Княгиня Паскевич скончалась 14 апреля 1925 года. Похороны были бедными; достаточно сказать, что похоронили Ирину Ивановну в простом черном гробу, но не в фамильном склепе, рядом с мужем, а прямо в бывшем княжеском парке, под березой, возле стены Петропавловского собора. В 30-е годы могилу княгини разорили, а останки перезахоронили на православном крестьянском кладбище, на самой окраине тогдашнего города, где со временем ее новая могила также затерялась.

**Александр РОГАЛЕВ,**
**доктор филологических наук, профессор кафедры русского, общего и славянского языкознания.**

## Спартыўныя навіны

У Гродне прайшлі фінальныя спаборніцтвы па гандболу сярод жаночых каманд у праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў.

Восем каманд былі размеркаваны на дзве падгрупы і толькі па дзве лепшыя прадоўжылі барацьбу за ўзнагароды.

У выніку месцы размеркаваліся так: Акадэмія фізічнай культуры (г. Мінск), Гродзенскі дзяржуніверсітэт і ГДУ. Каманду нашага універсітэта трэніруе заслужаны трэнер Беларусі, дацэнт В.П. Крукоўскі.

***

У Гомельскай ДЮСШ №2 адбылося першынство горада па настольнаму тэнісу сярод студэнтаў ВНУ.

Сярод жаночых каманд на прыступку гонару ўзышлі: факультэт фізічнай культуры ГДУ, зборная нашага універсітэта (усе студэнткі эканамічнага факультэта) і БелДУТ.

У спаборніцтвах мужчын у тройку прызёраў увайшлі: зборная каманда ГДУ, БелДУТ і факультэт фізічнай культуры.

***

У басейне УПП глухіх прайшло першынство ГДУ па плаванню сярод студэнтаў. У ім прынялі ўдзел больш за 80 чалавек.

Першую тройку прызёраў сярод мужчынскіх каманд узначаліў геолага-геаграфічны факультэт – 302 ачкі, на другім месцы – юрфак – 212 ачкоў і на трэцім – эканомфак – 185 ачкоў. Перамогу аспрэчвалі 7 каманд.

Першынство сярод каманд дзяўчат сабрала 9 факультэтаў. Лепшымі былі студэнткі эканамічнага факультэта – 162 ачкі, на другім месцы – юрфак – 148 ачкоў і на трэцім – філфак – 93 ачкі.

***

14 каманд-факультэтаў прынялі ўдзел у першынстве універсітэта па баскетболу.

У выніку мацнейшымі сярод каманд дзяўчат аказаліся баскетбалісткі гістарычнага факультэта, на другім месцы – факультэт замежных моў і на трэцім – эканомфак. Сярод мужчынскіх каманд прызавая тройка такая: фізічны, юрыдычны і матэматычны факультэты.

**В. МАРЧАНКА.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства – дацэнта;
– французскай мовы – выкладчыка;
– дыферэнцыяльныхураўненняў – дацэнта;
– вышэйшай матэматыкі – дацэнта;
– алгебры і геаметрыі – дацэнта;
– матэматычных праблем кіравання – дацэнта;
– радыёфізікі і электронікі – асістэнта;
– вылічальнай матэматыкі і праграміравання – дацэнта.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры фізічнага выхавання і спорту выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту названай кафедры **КВЯЦІНСКАМУ Станіславу Станіслававічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ** і ст.выкладчыку **ТКАЧОВУ Валянціну Валянцінавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **БАЦЬКІ**.

**Интервью**



## Наталья Дурова: «РАСПАХНУТЬ СЕРДЦЕ И ПОДАРИТЬ ЛЮДЯМ ПРАЗДНИК»

***Сейчас в гомельском цирке с большим успехом идет новая программа «Театр зверей Дурова». Приезд к нам впервые известного всему миру коллектива, единственного в своем роде – это настоящий праздник для всех любителей циркового искусства.***

***Династии артистов, дрессировщиков Дуровых – 140 лет, сейчас семейную эстафету с честью несет Наталья Юрьевна Дурова, художественный руководитель театра, народная артистка СССР и России. Она приезжала в г. Гомель, чтобы открыть парад звезд в своей программе, провести первые ее представления на гомельском цирковом манеже. К сожалению, ее большая занятость не позволила ей оставаться в Гомеле до конца гастролей театра.***

***Пресс-конференция Н.Ю. Дуровой с журналистами СМИ состоялась сразу же после ее приезда в Гомель. Беседа знаменитой дрессировщицы, детской писательницы с корреспондентами стала ее откровением о вещах, на первый взгляд, казалось бы к цирку не имеющих прямого отношения, но без которых общество, по глубокому убеждению артистки, не может быть нравственным. Поразила глубина ее человеческой сути, огромная любовь к жизни, к людям и братьям нашим меньшим. Об этом и не только – в публикуемом интервью.***

**– Наталья Юрьевна, в чем заключается Ваш, дуровский метод, дрессировки животных?**

– В нашем театре – их около 700, начиная от очень крупных – слонов, бегемотов, верблюдов, до крыс, котов, пернатых ... Мы работаем с ними без кнута и палки. Только любовь и добро... Что я, например, для большого слона? Пушинка... Но если я иду к нему с добром, ничего страшного ему не предвещаю, в руках моих – снедь... Этим я и побеждаю.... Ну, и конечно, гипноз. К сожалению, есть в большом цирке артисты, которые применяют к животным силу. Это жестокость, это не дрессировщики, а укротители. Но не такие, какой была знаменитая Ирина Николаевна Бугримова, которая любила животных до своего последнего дыхания. Жестокость часто встречается и в передвижных зооцирках, на которых зарабатывают деньги. Высылайте таких из вашего города, а зверей забирайте. Есть и хорошие зверинцы, где сберегают стареющие виды животных.

Нашим методом пользуются во многих странах. Так же и детей нужно воспитывать, без дидактики. Сейчас у нас в стране тысячи детей-беспризорников, которые просят милостыню в подземных переходах, но не на кусок хлеба, а на ... наркотики. Это страшно. Поэтому мы должны отвлечь детей от этого ужаса...

Я не могу видеть страдания детей, которые стали инвалидами. Поэтому когда мы закладывали наш театр (единственный в стране), сделали подиум и для колясочников, чтобы они смогли проехать и посмотреть животных, наш музей.

**– Расскажите, пожалуйста, о проекте «Храм детства», над которым Вы работаете.**

– У нас сейчас огромная стройка. Это то, о чем мечтали все Дуровы, вся династия. Это храм, который воспитывает детство, личность, не киллеров, а хороших людей, чьи таланты можно посмотреть уже с детства, растить романтиков, добрых людей. А ребенок плохим не рождается... К 2004 г. будет сдано уникальное здание, строительство которого курирует правительство Москвы. В нем будет и дрессура новых видов животных, с которыми не работают пока ни в одной из стран мира, и студийность (планируется преподавать драматургию, мастерство актера, историю кинематографии).

**– Известно, что Ваш театр зверей выступал в прошлом году в Израиле, когда там начались многочисленных теракты. Неужели в такое страшное время людям был интересен цирк?**

– Да, мы были там и вместо 15 спектаклей отработали свыше 30, получили награды, у меня – медаль Александра Невского, а у гуся Мартина – звание «герой дня». Мы пережили 7 терактов, которые возникали мгновенно, и тот, кто только что улыбался тебе, уже лежал мертвым. В Тель-Авиве, Вифлееме не было света, и мы выступали при работе аккумуляторов, и тысячи людей сидели в зале...

Сейчас то, что творится в Ираке, – это шоу в темноте. Те, кто его затеяли, не думают о состоянии планеты. Ведь все эти бомбы, которые полетели на землю, в море, погубят ее генофонд, который потом не восстановишь клонированием, и испорченная земля не простит людям.

**– Есть ли у Вас любимчики среди зверей-артистов?**

– Всех животных очень люблю, хотя есть у меня «приемные дети» – Яков Натальевич Дуров (Шимпанзе) (смеется) и гусь Мартин, который со мной повсюду. Он, кстати, ваш «земляк-белорус». Его подарили мне крохотным цыпленком в одном из совхозов под Минском, с той поры мы неразлучны.

(В этом довелось убедиться лично: гусь с элегантной бабочкой на шее расхаживал по холлу гостиницы, хлопал крыльями, то и дело «вставляя свое веское слово» в беседу Натальи Юрьевны с журналистами).

**– Известно, что Вы занимаетесь и писательской, а также большой общественной деятельностью...**

– Да, я член редколлегий журналов «Детская литература», «Дошкольное воспитание». Сейчас готовлю книгу для Англии о зоопарке Дж.Даррелла, который терпит большие убытки, распродает животных. Она будет называться «Один день делового шимпанзе». У меня вышел двухтомник «Я впрятки с жизнью не играю», который занял первое место на международной книжной ярмарке. Я очень дорожу жизнью, ценю каждый ее час и каждую секунду. Пишу в основном ночью, потому что не хватает времени в сутках. Сплю очень мало.

Каждое время имеет свою белую и черную полосу. Пусть не будет этой зебры, коварной, дикой, в нашей жизни. Для этого необходимо много работать. Надо распахнуть сердце и подарить людям праздник. Без праздника ребенок не вырастает личностью...

**Т.НИКОЛАЕВА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4161
Падпісана да друку 8.04.2003 г.